# ЗАТРЫМАНЫ ТРОЕ ПАДАЗРАВАЕМЫХ У КРАДЗЯЖЫ З НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

«Звязда» ўжо інфармавала сваіх чытачоў аб падзеях, якія адбыліся 23 красавіка ў аддзеле рэдкіх выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Нагадаем, што тады невядомым удалося вынесці з аддзела бібліятэкі 12 каштоўных кніг, кошт якіх на ўнутраным рынку ацэньваўся сумай каля 22,6 мільёна рублёў, хоць за межамі рэспублікі ён намнога большы. Самая старажытная з выкрадзеных кніг датуецца XV стагоддзем.

І вось з'явілася першая абнадзейлівая інфармацыя па гэтай гучнай справе. Як стала вядома карэспандэнту нашай газеты з дасведчаных крыніц, супрацоўнікамі крымінальнага вышуку, Следчага камітэта МУС і ГУУС Мінгарвыканкама ўстаноўлены асобы падазраваемых у крадзяжы кніг. Праваахоўнікамі па гэтай справе затрыманы студэнт 4-га курса БДУ, работнік унітарнага прадпрыемства «Белвідэапракат» і непрацуючая мінчанка 1977 года нараджэння. Зараз міліцыяй вышукваецца чацвёрты падазраваемы — навучэнец 5 курса Мінскага радыётэхнічнага каледжа, які быў раней судзімы за незаконнае захоўванне зброі. Трэба меркаваць, што праваахоўнікам удасца паспяхова завяршыць аперацыю па вышуку апошняга фігуранта і вярнуць каштоўныя кнігі бібліятэцы.

Ігар ГРЫШЫН.